# *2023 год*
# *ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ*

***Звесткі з архіва***
***Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі***

***Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.***

***У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з’яўляецца юбілейным.***

55 гадоў

**_Пташнікаў, І. Тартак : Аповесць / Іван Пташнікаў. – Мінск : Беларусь, 1968. – 294 с._**




Аповесць «Тартак» – адзін з самых вядомых твораў Івана Мікалаевіча Пташнікава (1932–2016), знакамітага празаіка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа.

Твор прысвечаны трагедыі беларускіх «хатыняў». Першапачаткова быў надрукаваны ў канцы 1967 года ў часопісе «Полымя» (№ 12). Літаратурныя крытыкі далі высокую ацэнку аповесці, і ў наступным 1968 годзе ў выдавецтве «Беларусь» яна надрукавана асобнай кнігай тыражом 12 500 экзэмпляраў.

Ілюстрацыі выдання выкананы мастаком В.Сакаловым. Пазней аповесць «Тартак» перавыдавалася ў зборніках твораў пісьменніка, у тым ліку і ў перакладзе на рускую мову.



# «Тартак» : 55 гадоў

У цэнтры аповесці «Тартак» — падзеі, убачаныя вачыма некалькіх герояў: Мірона Махоркі, хворага на кашаль Уладзіміра Панка, глухога дзеда Янука, Івана Боганчыка, жанчыны-маці Насты, дзяцей Тані і Алёшы. Яны, каб выратаваць вёску, вязуць збожжа ў мясцовую камендатуру. Акупанты паставілі ўмову: збожжа павінна быць здадзена заўтра да поўдня, інакш будзе спалена вёска. Адна і тая ж падзея — паездка семярых герояў у Краснае — паказана ад пачатку да канца праз індывідуальнае ўспрыманне кожнага. Праз аднаўленне перадгісторыі падзей вызначаюцца і паводзіны кожнага з іх у час смяротнай небяспекі, калі немцы паставяць падводы з людзьмі наперадзе свайго атрада, ратуючыся ад партызанскага агню. Мірон і Наста робяць усё магчымае, каб уратаваць дзяцей, Іван Боганчык ратуе сябе, як ратаваўся на пачатку вайны, калі ўцёк з арміі…

І. Пташнікаў скарыстаў разгорнутае параўнанне вайны з тартаком — лесапільняй, якая рэжа людзей па жывому: гінуць дзеці, старыя, нямоглыя і нявінныя. Эмацыянальны фон дзеі ў аповесці істотна ўзмацняе ідэя асуджэння фашызму, еднасць галасоў герояў і апавядальніка, успаміны апошняга пра перажытае падчас блакады 1944 г. на возеры Палік .

# «Тартак» : 55 гадоў

У аснову аповесці «Тартак» пакладзены рэальныя трагічныя падзеі, што адбыліся ў суседняй з Задроздзем (роднай вёскай І. Пташнікава) вёсцы Дальва, якую фашысты спалілі разам з жыхарамі (гл. пра гэта:
https://khatyn.by/be/filialy/dalva/tragediya ;

https://www.belta.by/regions/view/reportazh-simvol-tragedii-memorialnyj-kompleks-dalva-mesto-gde-objazan-pobyvat-kazhdyj-belorus-495325-2022/;

https://zviazda.by/ru/news/20230612/1686571621-79-let-nazad-nacisty-sozhgli-poslednyuyu-belorusskuyu-derevnyu ).



# «Тартак» : 55 гадоў




Надпіс-зварот на камені-помніку ў Дальве

Пра свае пачуцці, якімі была напоўнена праца над «Тартаком», Іван Пташнікаў пісаў так:

«Трагедыю Дальвы 1944 года я сам перажыў, і яна стаяла ў мяне ў памяці да самых апошніх дзён, калі я пісаў аповесць, яна не дае мне супакоіцца і цяпер не дасць, відаць, вечна. Бо таго, што было ў сорак чацвертым, ніколі не апішаш. Гэта быў год, калі фашысты, чуючы сваю гібель, сама горш звярэлі на нашай Плешчаніцкай, Лагойскай і Бягомльскай зямлі, палілі ў агні вёскі з людзьмі. Ад гібелі ратавала людзей зброя, зямля, лес, але ўсіх уберагчы не змагла. Пасля рэгулярных фашысцкіх часцей заставалася на месцы хат чорная зямля, і сухі, жорсткі, як жвір, яшчэ гарачы попел кляваў вочы і сушыў слёзы ў таго, хто аставаўся жыць».

# «Тартак» : 55 гадоў

«Трагізм вайны ў аповесці «Тартак» Івана Пташнікава паказаны не праз колькасць забітых людзей, знішчаных вёсак, а праз жудасныя карціны душэўных пакут людзей, што воляй лёсу апынуліся паміж двух агнёў і адчуваюць надыход нечага немінучага, жахлівага».

Серафім Андраюк

«Ні ў адным са сваіх ранейшых твораў Пташнікаў-мастак не адчуваў сябе так шырока і вольна, ні ў адным з іх яму не ўдавалася так глыбока зазірнуць у чалавечую душу , як у аповесці «Тартак». Але што ў «Тартаку» новае – дык гэта выяўленне самых глыбінных сувязей чалавека з жыццём, яго кроўнай зрошчанасці са светам, у якім ён жыве. Адсюль бярэ пачатак гуманістычная думка пісьменніка пра смерць як найвялікшую дысгармонію свету».

Вера Палтаран

«Па трагічным напаўненні, па стылі аповесць «Тартак» – адзін з самых «бязлітасна драматычных твораў у беларускай літаратуры».

Таццяна Шамякіна

# «Тартак» : 55 гадоў

У 1973 годзе на кінастудыі «Беларусьфільм» рэжысёр Віктар Карпілаў экранізаваў аповесць «Тартак». Сам пісьменнік выступіў у якасці аўтара сцэнарыя, захоўваючы практычна без змен асноўную сюжэтную канву. У галоўных ролях здымаліся вядомыя артысты: Генадзь Гарбук, Павел Дубашынскі, Маргарыта Громава, Марыя Захарэвіч, Алег Сідорчык і інш.

Паглядзець фільм «Тартак» сёння можна на канале YouTube па адрасе: https://www.youtube.com/watch?v=tKXEsf-pADI